**УДК [9(476)+2(=411.16)]“1944/1949”**

# ІЎДЗЕЙСКІЯ АБШЧЫНЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х гг.*

***канд. гіст. навук К.Р. КАРПЕКІН***
**Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, Віцебск**

*На аснове дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці асветлена гісторыя іудзейскіх абшчын Віцебшчыны другой паловы 1940-х гг. (на прыкладзе найбольш буйных рэлігійных груп, якія дзейнічалі ў Віцебску, Дрысе, Лепелі, Оршы і Полацку). Прааналізаваны такія аспекты, як савецкае заканадаўства, якое рэгулюе функцыянаванне рэлігійных аб'яднанняў, колькасны і сацыяльны склад суполак, дзейнасць іх кіруючых органаў. Асаблівая ўвага нададзена працэсу рэгістрацыі габрэйскіх малітоўных будынкаў і такой з'яве, як незарэгістраваныя міньяны ў прыватных кватэрах вернікаў. Прыведзены адрасы памяшканняў, у якіх праходзілі набажэнствы, а таксама імёны рабінаў і найбольш актыўных вернікаў.*

Перыяд Другой сусветнай вайны і першых пасляваенных гадоў стаў пераломным для яўрэяў, якія пражывалі на тэрыторыі Еўропы. Масавае знішчэнне насельніцтва прыхільнікамі нацысцкага рэжыму нанесла вялізныя страты сацыяльна-культурнаму развіццю яўрэйскай нацыі. Што тычыцца тэрыторыі Беларусі, то тут становішча яўрэяў было надта складаным. Статус самай шматлікай нацыянальнай меншасці, які яны мелі ў 1920–1930-я гг., змяніўся на статус супольнасці, чыя колькасць імкліва зменшылася – не толькі па прычыне Халакосту, але і ў выніку міграцыйных працэсаў. Вельмі адмоўным чынам на развіцці яўрэйскай нацыі ў БССР адбівалася антысеміцкая скіраванасць пасляваеннай палітыкі І.В. Сталіна.

У першыя пасляваенныя гады, як і ў папярэднія гістарычныя перыяды, пераважную большасць яўрэяў-вернікаў складалі іўдзеі. Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць становішча яўрэйскіх рэлігійных абшчын Беларусі ў другой палове 1940-х гг. (на прыкладзе Віцебшчыны). Да гэтага часу асобныя аспекты гісторыі іўдаізма на Віцебшчыне ў першыя гады пасля Вялікай Айчыннай вайны знаходзілі сваё адлюстраванне толькі ў публікацыях краязнаўчага характару [1–2]. Дадзенае даследаванне з’яўляецца спробай увесці ў навуковы ўжытак інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў дакументах з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

На працягу даследуемага прамежку часу асноўнымі нарматыўнымі дакументамі, якія рэгламентавалі дзейнасць рэлігійных аб’яднанняў СССР, з’яўляліся Канстытуцыя СССР 1936 г., пастанова СНК СССР “Аб парадку адкрыцця малітоўных будынкаў рэлігійных культаў” ад 19 лістапада 1944 г., пастанова Савета Міністраў СССР “Аб парадку абкладання падаткамі служыцеляў рэлігійных культаў” ад 3 снежня 1946 г., а таксама “Інструкцыя для ўпаўнаважаных Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР”, зацверджаная 17 студзеня 1945 г.

Згодна з артыкулам 124 згаданай Канстытуцыі за ўсімі грамадзянамі СССР прызнавалася свабода адпраўлення рэлігійных культаў і свабода антырэлігійнай прапаганды [3, с. 309]. Адной з абавязковых умоў рэгістрацыі рэлігійнай абшчыны з’яўлялася адкрыццё малітоўнага будынка, што ў сваю чаргу, згодна з указанай вышэй пастановай ад 19 лістапада 1944 г., было магчымым пры выкананні наступных умоў. Па-першае, хадайніцтва мусілі падпісаць не менш як 20 паўналетніх вернікаў пэўнай канфесіі, якія не былі пазбаўлены выбарчых правоў і пражывалі ў дадзенай мясцовасці. Па-другое, будынак павінен быў знаходзіцца ў належным тэхнічным і санітарным стане. Па-трэцяе, у ім не павінны былі знаходзіцца якіясьці ўстановы, прадпрыемствы ці жылыя памяшканні, якія немагчыма было б перамясціць у іншыя будынкі [4, арк. 2; 5, арк. 5 адв.].

Атрымаўшы дазвол на функцыянаванне малітоўнага будынка, рэлігійная абшчына мела права хадайнічаць пра рэгістрацыю. Паводле “Інструкцыі…”, зацверджанай 17 студзеня 1945 г., для гэтага вернікі павінны былі падаць упаўнаважанаму Савета па справах рэлігійных культаў адпаведную заяву, падпісаную не менш як 20 асобамі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту. У выпадку станоўчага рашэння ўпаўнаважаны ў 3-дзённы тэрмін накіроўваў у гарадскі ці раённы выканаўчы камітэт распараджэнне пра заключэнне з вернікамі дамовы пра перадачу ім малітоўнага будынка і богаслужбовай маёмасці. У сваю чаргу выканкам павінен быў заключыць такую дамову на працягу 7 дзён, пасля чаго абшчына накіроўвала ўпаўнаважанаму спісы сябраў свайго выканаўчага органа і рэвізійнай камісіі. У абавязкі сябраў выканаўчага органа ўваходзіла кіраванне і нагляд за малітоўным будынкам і маёмасцю абшчыны. Ён абіраўся на агульным сходзе рэлігійнага аб’яднання і павінен быў складацца не менш як з 3 чалавек. Колькасць сябраў рэвізійнай камісіі не павінна была перавышаць 3 асобы [5, арк. 6–6 адв.].

* Матэрыялы з НАРБ сабраны дзякуючы гранту Цэнтра «Сэфер» пры фінансавай падтрымцы Genesis Philanthropy Group (у межах дабрачыннай праграмы Charities Aid Foundation «Яўрэйскія супольнасці»).



polotsk.su

Рэгістрацыі падлягалі не толькі абшчыны і малітоўныя будынкі, але і рэлігійныя служыцелі. Згодна з указанай вышэй “Інструкцыяй…” падставай для дазволу на іх легальную дзейнасць з’яўлялася анкета, у якой святар паведамляў сваё імя, дату нараджэння, звесткі пра месца працы ў мінулым, наяўнасць судзімасці, а таксама пра сваё месцазнаходжанне і дзейнасць падчас Вялікай Айчыннай вайны. Абавязковай умовай рэгістрацыі рэлігійнага служыцеля была прапіска ў тым жа населеным пункце, у якім дзейнічала абшчына. У выпадку станоўчага вырашэння пытання ўпаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР па пэўнай вобласці выдаваў святару даведку пра рэгістрацыю [5, арк. 6 адв.]. Неабходна адзначыць, што паводле адпаведнай пастановы Савета Міністраў СССР ад 3 снежня 1946 г., рэлігійныя служыцелі ўсіх канфесій абкладаліся падаходным падаткам незалежна ад таго, у якой форме (грашовай ці натуральнай) яны атрымлівалі плату ад абшчыны. Калі яны спалучалі рэлігійную дзейнасць з працай у дзяржаўных установах, то падатак спаганяўся з усіх крыніц даходаў [6, арк. 48].

На падставе выяўленых архіўных крыніц можна меркаваць, што ў першыя гады пасля Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Віцебшчыны дзейнічала ўсяго некалькі больш-менш буйных іўдзейскіх абшчын: яны размяшчаліся ў такіх гарадах, як Віцебск, Дрыса, Лепель, Орша, Полацк. У астатніх раённых цэнтрах яўрэйскія рэлігійныя аб’яднанні былі зусім нешматлікімі. Ніжэй прыведзены звесткі, якія характарызуюць асноўныя накірункі дзейнасці дадзеных абшчын.

**Віцебск.** Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе ацалела некалькі будынкаў каменных сінагог, якія размяшчаліся па вул. Ільінскай, Валадарскай, 1-й і 2-й Ветранай (зараз гэта вул. Рэвалюцыйная, Суворава, Чэхава і Грыбаедава адпаведна) [4, арк. 7–8]. Праўда, у 1944–1945 гг. усе яны, акрамя першай, былі разбураны пры аднаўленні горада.

У такіх абставінах іўдзеі Віцебска былі вымушаны знайсці для абшчыны новыя культавыя будынкі. У пачатку 1947 г. яны спрабавалі зарэгістраваць 3 малітоўных дома: па Суражскай шашы, 148, Гарадоцкай шашы, 9 і па Магілёўскай вул. (цяпер указаныя вуліцы носяць назвы: Гагарына, Ленінградская, Калініна). Кіраўнікамі першых дзвюх ініцыятыўных груп з’яўляліся адпаведна Левік Абрамавіч Эпштэйн і Барыс Маісеевіч Сорын [7, арк. 130].

У верасні 1947 г. вернікі горада накіравалі ў Мінск свайго прадстаўніка для таго, каб ён хадайнічаў пра вылучэнне абшчыне будынка сінагогі, але ніякага адказу яны не атрымалі [8, арк. 52 адв.]. Каб здабыць памяшканне для малітоўных сходаў, сябры абшчыны дапамаглі адной удаве адрамантаваць яе дом (знаходзіўся на вул. Янаўскай, 4), за што яна дазволіла вернікам збірацца ў яе кватэры на рэлігійныя святы. Але ўжо пасля першай спробы правесці набажэнства, якая мела месца ў сакавіку 1948 г., группа іўдзеяў і гаспадыня дома былі выгнаны прадстаўнікамі Чыгуначнага райвыканкама г. Віцебска, а памяшканні аддадзены для пражывання гараджанам, жыллё якіх было разбурана падчас вайны [8, арк. 53].

У сувязі з вышэй апісанымі падзеямі прадстаўнік іўдзейскай абшчыны Меер Іцкавіч Папкоў 1 красавіка 1948 г. накіраваў скаргу ў Прэзідыўм Вярхоўнага Савета СССР, у якой даказваў права на ажыццяўленне набажэнстваў, спасылаючыся на Канстытуцыю 1936 г. [8, арк. 52–53].

Паводле меркавання Віцебскага аблвыканкама, дзеянні вернікаў былі незаконнымі. Сябры абшчыны, нібыта, уласнымі намаганнямі ўзвялі на вул. Янаўскай будынак, які першапачаткова меркавалася выкарыстоўваць пад сінагогу. Але паколькі абшчына не была зарэгістравана, яны дазволілі прапісацца там адной псіхічна нездаровай жанчыне, якая ў якасці ўдзячнасці за прадстаўленае жыллё бесперашкодна дазваляла праводзіць у доме набажэнствы [8, арк. 49].

У пачатку 1948 г. кіраўніком адной з незарэгістраваных іўдзейскіх абшчын Віцебска з’яўляўся Кацон Шлёмавіч Дон, які працаваў кавалём абласной канторы сувязі. У яго кватэры, якая мясцілася на вул. 2-й Ветранай, 3, і праводзіліся малітоўныя сходы [9, арк. 38]. Такая ж сітуацыя захоўвалася і ў пачатку 1949 г. Колькасць вернікаў, якія збіраліся у згаданым памяшканні на сходы, дасягала 100 чалавек [10, арк. 30].

У 1949 г. яўрэі-вернікі Віцебска ажыццявілі чарговую спробу легалізаваць сваю дзейнасць. 29 ліпеня яны правялі агульны сход, на якім абралі кіраўніцтва абшчыны. Рабінам стаў Шлёма Нохімавіч Мільнер, які нарадзіўся ў Віцебску ў 1878 г. у сям’і краўца і з 1900 г. да 1928 г. займаў пасаду рабіна. У склад духоўнага савета абшчыны ўвайшло 3 чалавекі: С.І. Галінкін, Ш. Траскоў і Б.І. Самадумскі. Акрамя таго была створана рэвізійная камісія ў складзе старшыні С.М. Гурэвіча і сябраў М.І. Папкова і Б.А. Галінкіна [11, арк. 174, 176].

5 жніўня 1949 г. іўдзеі Віцебска накіравалі ўпаўнаважанаму савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР заяву пра рэгістрацыю абшчыны. Для малітоўных сходаў вернікі выкарыстоўвалі 1 пакой плошчай 24 кв. м. у доме па вул. Гарадоцкай, 9 (2 іншыя пакоі былі жылымі) [11, арк. 171, 173]. Упаўнаважаны не задаволіў дадзенага хадайніцтва, паколькі абшчына не мела спецыяльнага малітоўнага будынка [12, арк. 134].

**Глыбокае.** На працягу даследуемага перыяду іўдзейская абшчына горада была настолькі малалікай (менш за 10 чалавек), што паводле рэлігійных правіл не магла самастойна праводзіць малітоўныя сходы. З гэтай прычыны па святах вернікі ездзілі ў Вільню [13, арк. 94 адв.].

PolotskSU

**Дрыса.** Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў адным ацалелым будынку былой сінагогі размяшчалася вышывальная арцель “20 гадоў УЛКСМ”. У канцы 1947 г. у Дрысе налічвалася 206 яўрэяў, у іншых населеных пунктах Дрысенскага раёна – 30. У склад іўдзейскай абшчыны горада ўваходзіла каля 30 сябраў [14, арк. 260].

У пасляваенныя гады вернікі Дрысы ніводнага разу не хадайнічалі перад мясцовымі ўладамі пра адкрыццё сінагогі, а праводзілі набажэнствы ў прыватных кватэрах. Так, у канцы 1947 г. для згаданых мэт вернікі-іудзеі арандавалі памяшканне ў жыхара горада Бенцыяна Эльевіча Шлемензона (знаходзілася на вул. Памежнай, 7) [14, арк. 260; 15, арк. 372].

**Лепель.** Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Лепелі захаваўся будынак сінагогі, які быў заняты маслазаводам. Летам 1947 г. вернікі-іудзеі накіравалі ў Лепельскі райвыканкам заяву, у якой паведамлялі, што яны не прэтэндуюць на згаданы будынак, але замест яго прасілі прадаставіць ім у карыстанне дом па вул. Валадарскага, 35. Раней ён належаў яўрэйскай сям’і, якая загінула падчас вайны. Мясцовыя ўлады адказалі на дадзенае хадайніцтва адмовай, матывуючы гэта тым, што ў памяшканні пражываюць гараджане. Пасля гэтага – 19 ліпеня 1947 г. – вернікі адправілі ўпаўнаважанаму савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР аналагічную скаргу, у якой патрабавалі альбо вярнуць ім сінагогу, альбо вылучыць іншы будынак. У сваю чаргу 24 ліпеня 1947 г. іудзеі Лепеля прапаноўвалі Віцебскаму аблвыканкаму выселіць з невялікага будынка памерам 36 кв. м. траіх гараджан і перадаць яго абшчыне. Справа скончылася тым, што 5 верасня 1947 г. упаўнаважаны савета не толькі не дазволіў вылучыць вернікам якісьці будынак, але ўвогуле забараніў ім праводзіць любыя сходы, паколькі абшчына не была зарэгістраванай [9, арк. 38].

Паводле прыкладных падлікаў, у пачатку 1948 г. у горадзе налічвалася каля 40 вернікаў-іудзеяў. Яны, як і раней, не мелі зарэгістраванага памяшкання для здзяйснення набажэнстваў і збіраліся ў прыватных кватэрах. Малітоўнымі сходамі ў гэты час кіравалі Моўша Кастрыелевіч Амхір (пражываў па вул. Валадарскага, 58) і Хана Моўшавіч Славін (пражываў па вул. Валадарскага, 42) [16, арк. 38].

Да 1949 г. колькасць сябраў абшчыны не змянілася, яе кіраўніком у гэты час з’яўляўся Хана Моўшавіч Славін [10, арк. 30].

**Орша.** У пачатку 1946 г. вернікі-іудзеі Оршы падалі ўпаўнаважанаму савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР па Віцебскай вобласці хадайніцтва пра рэгістрацыю малітоўнага дома і абшчыны, але доўгі час не атрымлівалі ніякага адказу [17, арк. 227]. У выніку абшчыне было адмоўлена [14, арк. 259].

У верасні 1946 г. іудзеі горада правялі агульны сход, на якім абралі кіруючы орган абшчыны. Старшынёй духоўнага савета стаў Іцка Бенцыянавіч Пячэрскі, вучоным сябрам савета – Пінхус Мееравіч Свярбілаў, казначэем – Арон Пейсахавіч Нодаў, сябрамі савета – Самуіл Беніямінавіч Позін, Іосіф Нохімавіч Рыўкін, Мардух Мендалевіч Трусман, Якаў Абрамавіч Хшыва. Усе справы па афармленні дакументаў па хадайніцтву пра адкрыццё ў горадзе сінагогі былі даручаны Я.А. Хшыве і Моўшы Беніямінавічу Беленсону (аднаму з вернікаў) [6, арк. 2].

Усяго, паводле рэгістрацыйнага спіса, у склад іудзейскай абшчыны ўвайшло 32 чалавекі (24 мужчыны і 8 жанчын). Самымі шматлікімі ўзроставымі групамі сярод мужчын былі асобы ад 60 да 69 гадоў (29% ад агульнага ліку мужчын). Вернікі ад 30 да 39 і ад 40 да 49 гадоў налічвалі па 12,5%. Асобы старэйшыя за 80 гадоў складалі толькі 4 %. Што тычыцца жанчын, то палова з іх мела ўзрост ад 50 да 59 гадоў, на другім месцы паводле колькасці знаходзіліся вернікі ад 40 да 49 гадоў (37,5%), затым – ад 30 да 39 гадоў (12,5%). Прафесійны склад аршанскай іудзейскай абшчыны ўяўляў сабой наступнае. Сярод мужчын значную частку складалі пенсіянеры (63%) і рабочыя (33%), астатнія (4%) з’яўляліся работнікамі сферы абслугоўвання. Пераважная большасць жанчын (62,5%) былі хатнімі гаспадынямі, астатнія прафесійныя групы (рабочыя, работніцы сферы абслугоўвання, інваліды) паводле сваёй колькасці з’яўляліся раўназначнымі (па 12,5%) [6, арк. 8].

Да гэтага часу паводле вуснага дазволу старшыні аддзела камунальнай гаспадаркі Аршанскага гарвыканкама на месцы былой сінагогі вернікі паспелі ўзвесці сцены для новага малітоўнага будынка (з дрэва, даўжынёй 11 м. і шырынёй 7 м.). Але ў верасні 1946 г. Аршанскі гарсавет забараніў завяршыць будаўніцтва. У выніку вернікі звярнуліся ў Віцебскі аблвыканкам і спасылаючыся на тое, што яны затрацілі ўласныя намаганні і сродкі, прасілі дазволіць ім дабудаваць сінагогу. Паколькі дазвол на вяртанне сінагогі атрыманы не быў, падчас восеньскіх навагодніх святаў 1946 г. вернікі збіраліся у прыватным доме Софры Сойкінай, які размяшчаўся па вул. Савецкай, 84 [6, арк. 3, 6].

5 снежня 1946 г. вернікі правялі чарговы сход па перавыбранні кіраўніцтва абшчыны. Рабінам быў прызначаны Пінхус Мееравіч Свярбілаў, сябрамі выканаўчага органа – Іцка Беніямінавіч Пячэрскі, Янкель Абрам-Лейбавіч Хшыва і Арон Пейсахавіч Нодаў, сябрамі рэвізійнай камісіі – Іосіф Нохімавіч Рыўкін, Самуіл Беніямінавіч Позін і Марыя Аронаўна Свірман [6, арк. 9]. Тады ж абшчына заключыла з рабінам дамову на прадмет арэнды яго дома па вул. Калгаснай, 10 і выкарыстання ў якасці малітоўнага

памяшкання. Тэрмін арэнды мусіў доўжыцца 3 гады, плата складала 150 рублёў штомесяц, прычым ацяпленне і асвятленне ажыццяўляліся за кошт сябраў абшчыны [6, арк. 10].

Вясной 1947 г. вернікі прасілі дазволіць ім арандаваць для малітоўных сходаў згаданы вышэй будынак па вул. Калгаснай, 10. Упаўнаважаны савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР і Віцебскі аблвыканкам былі схільны даць дазвол і ў маі 1947 г. накіравалі адпаведны ліст у Маскву [17, арк. 237].

У жніўні 1947 г. Савет па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР паведаміў, што ён не бачыць неабходнасці адчыняць у Оршы іўдзейскі малітоўны дом, бо там не пражывае дастаткова вялікай колькасці вернікаў і не маецца свабодных будынкаў. Пасля гэтага вернікі пачалі пісаць скаргі не толькі кіраўніцтву БССР, але і І.В. Сталіну [15, арк. 164, 187].

Усяго ў гэты час у горадзе пражывала каля 2 тыс. паўналетніх яўрэяў, з якіх сябрамі іўдзейскіх абшчын паводле розных дадзеных з'яўляліся ад 300 да 400 чалавек [14, арк. 259].

Да восені 1947 г. сябры абшчыны ўласнымі сіламі ўзвялі будынак па вул. Калгаснай, 23, які яны планавалі выкарыстоўваць для малітоўных сходаў, і ў канцы кастрычніка 1947 г. накіравалі ўпаўнаважанаму савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР чарговае хадайніцтва пра адкрыццё ў Оршы сінагогі, якое падпісалі 360 чалавек. У пачатку лістапада 1947 г. заяву аналагічнага зместу сябры іўдзейскай абшчыны накіравалі старшыні Савета Міністраў БССР П.К. Панамарэнку. Яны прасілі яго паскорыць працэс разгляду іх пытання і паспрыяць адкрыццю малітоўнага дома [15, арк. 223, 250, 352].

Па ўсёй верагоднасці, дазвол дадзены не быў, бо напрыклад, у лютым 1948 г. сябры іўдзейскай абшчыны на малітоўныя сходы збіраліся ў кватэры Арона Шаевіча Чарняка, якая размяшчалася па адрасе: вул. Калгасная, 8. Будынак жа, які меркавалася арандаваць, ніякім чынам не выкарыстоўваўся, а ключы ад яго захоўваліся ў сябра сінагагальнага савета [15, арк. 136–138, 141].

У сакавіку 1949 г. паводле рашэння савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР іўдзейскай абшчыне горада было адмоўлена ў адкрыцці сінагогі ў доме па адрасе вул. Калгасная, 25, які належаў Іосіфу Рыўкіну. Для абвяшчэння гэтага рашэння двое прадстаўнікоў ад абшчыны (Арон Пейсахавіч Нодаў і Пінхус Меeравіч Свярбілаў) былі выкліканы ў Аршанскі гарсавет [18, арк. 63].

У 1949 г. аршанская іўдзейская абшчына налічвала прыкладна 360 вернікаў, як і раней, на набажэнствы яны збіраліся ў доме па вул. Калгаснай, 8, іх кіраўніком з'яўляўся Пінхус Меeравіч Свярбілаў [10, арк. 30].

**Полацк.** У 1946 г. 1 будынак былой сінагогі, які меўся на тэрыторыі Полацкай вобласці, выкарыстоўваўся як вытворчае памяшканне [19, арк. 108; 20, арк. 106].

На працягу 1946–1947 гг. вернікі горада не хадайнічалі перад мясцовымі ўладамі пра вяртанне ім указанай сінагогі і збіраліся для ажыццяўлення набажэнстваў у прыватных кватэрах [8, арк. 2]. Тым не менш адначасова з гэтым, у пачатку 1947 г. на вул. Астроўскага яны пачалі ўзводзіць драўляны малітоўны будынак, сродкі для якога збіралі ўсе сябры абшчыны [21, арк. 126 адв.]. Дадзенае будаўніцтва было дазволена толькі Полацкім гарсаветам і не было ўзгоднена з вышэйстаячымі структурамі. У сувязі з гэтым упаўнаважаны савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР пастанавіў пасля завяршэння будаўніцтва перадаць дом у распараджэнне аддзела камунальнай гаспадаркі Полацкага гарвыканкама [21, арк. 236].

У пачатку 1948 г. у межах Полацкай вобласці налічвалася больш за 2,5 тыс. яўрэяў-вернікаў [22, арк. 153], з якіх каля 250 пражывалі ў Полацку. У гэтым годзе абшчына падала заяву пра рэгістрацыю, у якасці малітоўнага памяшкання быў прапанаваны дом з плошчай жылых памяшканняў амаль 38 кв. м., які знаходзіўся на вул. Будзённага, 1а і належаў Р.М. Аўстрэйху. Усяго пад заявай паставіў подпіс 101 чалавек. Полацкі аблвыканкам адмовіў у дадзеным хадайніцтве, растлумачыўшы сваё рашэнне тым, што памеры будынка не адпавядаюць колькасці вернікаў [13, арк. 94]. У пачатку сакавіка 1948 г. упаўнаважаны ад абшчыны Саламон Рафаілавіч Грынблат падаў чарговае хадайніцтва: на гэты раз вернікі прасілі дазволіць ім праводзіць набажэнствы ў доме па вул. Гогалеўскай, 35/52, які належаў Арону Зэлікавічу Сегалю. У выніку ніякага дазволу іўдзеі Полацка не атрымалі. Каб спыніць падобныя заявы ўпаўнаважаны савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР загадаў старшыні Полацкага гарсавета прымяніць у адносінах да вернікаў такія меры, як штрафаванне і абкладанне падаткамі кіраўнікоў ініцыятыўных груп і асоб, якія здавалі памяшканні ў арэнду, узбуджэнне супраць іх крымінальных спраў за правядзенне несанкцыяваных сходаў [13, арк. 5].

Паводле стану на 4 верасня 1948 г. у горадзе мелася 1 незарэгістраваная іўдзейская абшчына (адзіная на ўсю вобласць) [9, арк. 193]. З ліку рэлігійных служыцеляў у 1949 г. у Полацку меўся 1 рэзнік [7, арк. 36 адв.].

**Шаркаўшчынскі раён.** У пачатку 1946 г. у раёне дзейнічала невялікая (менш за 20 вернікаў) іўдзейская абшчына, якая не была зарэгістравана і не мела рабіна [19, арк. 107].

Такім чынам, у другой палове 1940-х гг. у межах віцебскага рэгіёна функцыянавалі нешматлікія іўдзейскія абшчыны, сацыяльную базу якіх складалі асобы сталага ўзросту. Паводле дзеючага ў даследуемы перыяд часу заканадаўства, любая рэлігійная абшчына, якая прайшла рэгістрацыю, атрымлівала права на функцыянаванне. На практыцы іўдзейскія аб'яднанні сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцяў, якія не

дазволілі ім разгарнуць легальную дзейнасць. У выніку, у другой палове 1940-х гг. на тэрыторыі Віцебшчыны не існавала ніводнай афіцыйна зарэгістраванай яўрэйскай рэлігійнай абшчыны.

ЛІТАРАТУРА


1. Подлипский, А.М. Евреи в Витебске : в 2 т. Т. 2 / А.М. Подлипский. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2012. – 184 с.
2. Шульман, А. На перекрестке столетий / А. Шульман. – Минск : Медисонт, 2011. – 196 с.
3. Кукушкин, Ю.С. Очерк истории Советской Конституции / Ю.С. Кукушкин, О.И. Чистяков. – М. : Политиздат, 1987.
4. Указания, сведения, переписка и заявления по религиозным культам // Государственный архив Витебской области (далее – ГАВО). – Ф. 4029. Оп. 1. Д. 1.
5. Инструкции, указания Совета, цифровые сведения и информационные отчеты по религиозным культам // ГАВО. – Ф. 4029. Оп. 2. Д. 1.
6. Указания, сведения, акты, ориентировки, переписка и заявления по религиозным вопросам // ГАВО. – Ф. 4029. Оп. 1. Д. 2.
7. Докладные записки уполномоченного, переписка с Советом о деятельности религиозных общин и сект // Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). – Ф. 952. Оп. 2. Д. 12.
8. Докладные записки и переписка с Советом по делам религиозных культов о деятельности религиозных общин // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 12.
9. Докладные записки и сведения Уполномоченного Совета о деятельности религиозных общин // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 11.
10. Переписка с Советом, уполномоченными Совета и исполкомами местных Советов о деятельности религиозных общин и сект // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 21.
11. Заявления и жалобы верующих и духовенства // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 18.
12. Информационные отчеты уполномоченного Совета. Планы работы уполномоченного, сведения о деятельности религиозных общин и сект // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 20.
13. Информационные отчеты уполномоченного Совета о деятельности религиозных общин и сект, переписка с Советом и уполномоченным по Полоцкой области // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 15.
14. Докладные записки и сведения Уполномоченного Совета о деятельности ралигиозных общин // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 11.
15. Материалы заседания Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР, докладные записки, сведения, переписка // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 7.
16. Переписка с уполномоченным по Полоцкой области о проведении религиозных праздников и деятельности общин // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 17.
17. Материалы о деятельности религиозных общин и сект (докладные записки, справки, сведения, жалобы верующих и служителей культа, переписка) // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 8.
18. Материалы о деятельности религиозных общин и сект (решения исполкомов местных Советов, заключения Уполномоченных, докладные записки, переписка, жалобы и заявления верующих) // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 1. Д. 17.
19. Информационные отчеты и докладные записки уполномоченного Совета по делам религиозных культов при облисполкомах о деятельности религиозных общин и сект // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 5.
20. Информационные отчеты и докладные записки уполномоченного Совета по делам религиозных культов при облисполкомах о деятельности религиозных общин и сект // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 6.
21. Информационные отчеты уполномоченного Совета о деятельности религиозных общин и сект. Планы работы уполномоченного // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 10.
22. Информационные отчеты уполномоченного Совета о деятельности религиозных общин и сект. Планы работы уполномоченного // НАРБ. – Ф. 952. Оп. 2. Д. 13.


Polotsksu

## JUDAIC COMMUNITIES OF VITEBSK REGION IN SECOND HALF 1940th

***K. KARPEKIN***

*In the article on the basis of documents of National archive of Republic Byelorussia, the State archive of Vitebsk is lighted up history of judaic communities of Vitebsk region of the second half 1940th (on the example of the most large religious groups operating in Vitebsk, Drissa, Lepel, Orsha and Polotsk). Such aspects are analysed, as soviet legislation, regulative functioning of religious associations, quantitative and social composition of communities, activity of their leading organs. The special attention is spared to the process of registration of Jewish of prayer building and such phenomenon, as unregistered miniens in the private apartments of believers. The addresses of apartments, divine services, and also names of rabbis and most active believers, passed in that, are indicated in the article.*